“Для чалавека няма няшчасця жудасней рабскага лёсу” (Сафокл)



ШКЛОЎ-*інфо*

№13 (95) верасень 2014

П А З Н А В А Л Ь Н А - А Н А Л І Т Ы Ч Н А Я   М Я С Ц О В А Я   Г А З Е Т А

Выходзіць   2 разы ў месяц   *Заснавана ў ліпені 2009 г.*

чытайце нас зараз і на kamunikat.org

В Шкловском районе с целью профилактики преступлений активно проверяют образ жизни и поведение 368 лиц, имеющих судимость и состоящих на учете в уголовно-исполнительной инспекции Шкловского РОВД. Интересно, попали ли в этот список руководители и специалисты коммунальных предприятий, ранее отбывавших тюремные сроки за различные преступления?

За первое полугодие 2014 года в Могилевской области с убытками сработали 115 организаций (13% от общего количества), тогда как за аналогичный период прошлого — 62 (7%). Сумма чистого убытка таких организаций за первое полугодие нынешнего года составила 1 023,8 млрд. рублей — это в 2,2 раза больше, чем за аналогичный период прошлого. Самые убыточные сферы в Могилевской области — промышленность (24,4% от всех убыточных организаций), гостиницы и рестораны (11,8%,) и транспорт (11,3%). Чистая прибыль, в свою очередь, снизилась с 1 698,1 млрд. рублей (за первое полугодие 2013 года) до 280,9 млрд. рублей — в этом году, составив, таким образом, лишь 16,5% прошлогоднего значения.Рентабельность реализованной продукции, товаров, работ и услуг организаций Могилевской области по итогам первого полугодия составила 4,9% (7,3% — за такой же период 2013 года), а рентабельность продаж — 4,1% (5,9%).

Шклоўскія ўлады ігнаруюць звароты грамадзян

Рыгор Кастусёў 11 жніўня асабіста звярнуўся ў пракуратуру Шклоўскага раёна са скаргай на дзеянні чыноўнікаў мясцовага райвыканкама, якія не выконваюць Закон аб зваротах грамадзян.

Па словах Рыгора Кастусёва, ён вымушаны быў звярнуцца ў пракуратуру Шклоўскага раёна, бо шклоўскія чыноўнікі так і не далі ніякага адказу на яго двухразовыя пісьмовыя звароты з прапановамі на імя старшыні Шклоўскага райвыканкама Аляксандра Бойкі.

“Я двойчы звяртаўся да старшыні Шклоўскага райвыканкама Аляксандра Бойкі з прапановамі ад імя грамадзянскай ініцыятывы “Шклоўскі Магістрат” з прапановамі аб размяшчэнні на будынку Шклоўскай гарадской ратушы шыльды з інфармацыяй аб важных гістарычных падзеях у жыцці Шклова, а таксама з прапановай аб ініцыяванні стварэння свабоднай эканамічнай зоны на тэрыторыі Шклоўскага раёна, - распавядае Рыгор Кастусёў. – Я асабіста як грамадзянін Беларусі накіроўваў гэтыя пісьмовыя прапановы спадару Аляксандру Бойка ўжо двойчы – 25 красавіка 2014 года і 16 чэрвеня 2014 года. Ніякага адказу са Шклоўскага райвыканкама да гэтага часу я не атрымаў, што з’яўляецца грубым парушэннем Закона аб зваротах грамадзян з боку чыноўнікаў. 11 жніўня я завітаў на прыём да пракурора Шклоўскага раёна Дзмітрыя Лянчэўскага і перадаў яму пісьмовую заяву наконт таго, каб пракуратура высветліла, наколькі адпавядаюць такія дзеянні чыноўнікаў Шклоўскага райвыканкама беларускаму заканадаўству”.

Таксама Рыгор Кастусёў паведаміў, што 11 жніўня ён перадаў у Магілёскі аблвыканкам свой пісьмовы зварот на імя старшыні аблвыканкама Пятра Рудніка з прапановамі аб размяшчэнні на будынку Шклоўскай гарадской ратушы шыльды з інфармацыяй аб важных гістарычных падзеях у жыцці Шклова, а таксама з прапановай аб ініцыяванні стварэння свабоднай эканамічнай зоны на тэрыторыі Шклоўскага раёна. У звароце на імя старшыні аблвыканкама Рыгор Кастусёў паведаміў Пятру Рудніку, што ўжо двойчы звяртаўся па гэтаму пытанню ў Шклоўскі райвыканкам, аднак ніякага адказу з гэтай дзяржаўнай установы так і не атрымаў.

P.S. Дзе ж там **спадару Бойка** займацца нейкімі там грамадзянамі, калі трэба сістэматычна думаць аб лёсе сваіх паплечнікаў, якія ўсё часцей пападаюць ў кутузку. Ды можа і самому пара ўжо сушыць сухары пры такіх хаўрусніках - справы ў раёне вельмі ўжо ня добрыя.

У Магілёве абмяркавалі пытанні росту карупцыйных злачынстваў у галіне сельскай гаспадаркі

У Магілёве ў грамадскім цэнтры "Кола" 10 жніўня адбыўся круглы стол, на якім былі абмеркаваны праблемы росту карупцыйных злачынстваў у галіне сельскай гаспадаркі Магілёўскай вобласці, а таксама факты парушэння правоў працаўнікоўсельскагаспадарчых прадпрыемстваў пры рэфармаванні сельгаспрадпрыемстваў, калі меркаванні простых працаўнікоў гаспадарак ігнаруюцца чыноўнікамі.

Удзел у круглым стале прынялі спецыялісты ў галіне сельскай гаспадаркі і незалежныя журналісты з розных рэгіёнаў Магілёўшчыны. У якасці арганізатара мерапрыемства выступіў выдавецкі цэнтр Магілёўскай рэгіянальнай кааліцыі дэмакратычных сіл. Падтрымку ў арганізацыі правядзення круглага стала таксама аказала і Магілёўская філія ГА "БАЖ".

Падчас круглага стала былі заслуханы выступленні чатырох экспертаў у галіне сельскай гаспадаркі, якія распавялі пра сваё бачанне рашэння праблемы карупцыйных злачынстваў у сельскагаспадарчай сферы, прывёўшы канкрэтныя прыклады такіх правапарушэнняў у розных рэгіёнах Магілёўшчыны.

Асаблівая ўвага была нададзеная парушэнню правоў працаўнікоў вёскі ў святле нядаўна прынятых кіраўніком краіны 4-х указаў аб рэфармамаванні ў галіне сельскай гаспадаркі.

Як падкрэсліў адзін з выступоўцаў, былы дырэктар саўгаса "Іскра" Рыгор Кастусёў, "адначасовым прыняццем ажно 4-х Указаў па сельскай гаспадарцы (чаго ў гісторыі Беларусі яшчэ не назіралася), кіраўніцтва краіны практычна ўзаконіла рабаўніцтва сялянства, якое працягваецца ў нашай краіне пад выглядам правядзення рэформаў ужо больш 10 апошніх гадоў. Больш дзесяцігоддзя ў нашай краіне пад выглядам рэфармавання сельскай гаспадаркі інтэнсіўна ідуць працэсы зліцця двух-трох суседніх гаспадарак у адну і перавод новастворанных гаспадарак у гаспадаркі з новай формай уласнасці. Былыя калгасы, саўгасы ператвараюцца ў ААТ (Адкрытыя акцыянерныя таварыствы), ЗАТ (Закрытыя акцыянерныя таварыствы), сельскагаспадарчыя кааператывы, якія надалей перадаюцца ў распараджэнне або ўласнасць новым гаспадарам. Праз прыняцце новых заканадаўчых актаў, што не прадугледжваюць роўныя правы для грамадзян Беларусі па прыватнай ўласнасці на зямлю, як і ў гады існавання савецкай улады, беларуская дзяржава імкліва выбівае з селяніна апошнія рэшткі пачуцця ўласніка, гаспадара свайго жыцця. Як і ў далекія 20-ыя, 30-ыя гады мінулага стагоддзя ў часы калектывізацыі, калі сялянства сілай пазбаўлялася прыватнай уласнасці на зямлю, на сродкі вытворчасці і заганялася ў калгасы, беларускія ўлады зноўку прымаюць рашэнні па рэфармаванню сельгаспрадпрыемстваў, нават не цікавячыся меркаваннямі сённяшніх калгаснікаў і бессаромна пазбаўляюць сялян іх калектыўнай уласнасці".

Іншы выступоўца, кандыдат эканамічных навук Пётр Мігурскі, засяродзіў увагу удзельнікаў круглага стала на неабходнасці падвышэння грамадскага кантролю за органамі выканаўчай улады і праваахоўнымі органамі ў пытаннях барацьбы з карупцыяй.

"Ці можна спадзявацца ў навядзенні парадку на эканамічнай прасторы вобласці на сілавыя структуры – органы МУС, КДБ, КДК, Следчы камітэт? Так, але ж, напрыклад, справа "адкатаў" на дзяржпрадпрыемствах зайшла так далёка, што большасць "саплівых" маркетолагаў нават і не ўтойваюць свае "левыя" крыніцы ўзбагачэння. Ды і да саміх "барацьбітоў" ёсць пытанні: арыштаваны па артыкулу "карупцыя" "перавертні ў пагонах" з Клімавічскага РАУС, шклоўскі начальнік ДФР КДК, магілёўскі суддзя, якія самі павінны былі стаяць на ахове правапарадку. Ёсць пытанні і да прыватнага бізнэсу, але ж ён працуе ў квазірынкавых умовах і не можа быць у дадзеным выпадку цывілізаваным. Таму ўсе спробы ўлад падвысіць эфектыўнасць эканомікі будуць разбівацца аб камяні своеасаблівых адносін "прыватнае-дзяржаўнае". Яшчэ больш "адкатная" хвароба распаўсюджана ў бюджэтнай сферы. Закупка абсталявання ў адукацыйныя і медыцынскія ўстановы (асабліва за валюту), іх капітальны рамонт – гэта бязмерныя магчымасці для чыноўнікаў, якія рэгулююць таварныя і фінансавыя патокі для забяспячэння іх функцыявання. Ды ці мала другіх магчымасцяў у нячыстых на руку чыноўнікаў – ЖКГ, арэндныя адносіны, сельская гаспадарка. На пытанне, ці дазваляюць зараз супрацоўнікам сілавых ведамстваў правяраць начны развоз малочных і мясных прадуктаў па крамах з адпаведных перапрацоўчых прадпрыемстваў, адказныя асобы разводзяць рукамі.

Вось таму і ўражанне, што ніхто зараз са злодзеяў-карупцыянераў

нікога не баіцца і не зважае на маральныя нормы і грамадскую думку. Дзяржаўныя СМІ стараюцца абыходзіць шматлікія факты, суды над карупцыянерамі праходзяць у закрытым рэжыме. Агалосцы даюцца толькі крымінальныя справы, якія выгадныя ўладзе. Нават кіраўнік дзяржавы, які раз пораз аб’яўляе барацьбу карупцыі, бяссільны ў гэтай справе барацьбы, не разумеючы, што самы надзейны заслон злодзеям можа паставіць толькі дэмакратычны дзяржаўны лад. Як жа да карупцыйных праблем ставіцца мясцовая ўлада? У справаздачы Магілёўскага абласнога выканаўчага камітэта за 2012,2013 гады слова “карупцыя” не згадана ні разу, такія ж адносіны да карупцыйных праблем як у Магілёўскім гарвыканкаме, так і ў шклоўскіх вертыкальшчыкаў. Адзін раз пра карупцыю згадалі ў справаздачы прэзідыума абласнога Савета дэпутатаў – відаць і ў аблсавеце не вельмі шануюць гэту тэму. Вось чаму ў тым ліку грамадскасць павінна больш крытычна адносіцца да тэмы карупцыі і шукаць прычыны замоўчвання праблемы выканаўчай уладай. Але можа з карупцыяй у Магілёўскай вобласці даўно пакончана ці ёсць дадатныя зрухі ў праваахоўных органаў? Не, гэта не так. Напрыклад, у 2012 гаду ў Магілёўскай вобласці выяўлена і пастаўлена на ўлік 209 злачынстваў карупцыйнага напрамку, не палепшылася становішча ў 2013 годзе – колькасць карупцыйных злачынстваў павялічалася на 30,5% у параўнанні з папярэднім годам і склала на 1,2% больш сярэдняга паказчыка па Беларусі. Толькі за 5 месяцаў 2014 года выяўлена 101 карупцыйнае злачынства. Пры гэтым, абласная пракуратура канстатуе, што за апошнія 5 гадоў іх колькасць не памяншаецца. Яшчэ на слыху гучныя затрыманні службовых асоб у Магілёўскай вобласці: генеральнага дырэктара “Крычаўцементашыферу”, галоўнага ўрача Касцюковічскай бальніцы, дырэктара “Магілёўдрэва”, заведзеная крымінальная справа на кіраўніка “Строммашыны”.

Але чаму мясцовая “вертыкаль” так індэферэнтна адносяцца да гэтай тэмы? Справа ў тым, што болей за траціну (35%) ад агульнай колькасці карупцыйных злачынстваў рэгіструецца ў сістэме органаў мясцовай улады і падначаленых ім структурных падраздзяленняў. А найбольшую ўдзельную вагу займаюць крадзяжы шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі (34%), дача хабару (33%), атрыманне хабару (11%), злоўжыванне ўладай (9%). Згадзіцеся, радаваму грамадзяніну ў радах карупцыянераў месца проста няма”, - выказаў сваё меркаванне Пётр Мігурскі.

Адбылася працяглая дыскусія ўдзельнікаў сустрэчы наконт прыняцця неабходных мер для пераадолення такой прыкрай з’явы, як карупцыя ў галіне сельскай гаспадаркі Магілёўскай вобласці. Удзельнікі круглага стала таксама практычна аднагалосна выказаліся за тое, каб улада максімальна ўлічвала інтарэсы і абараняла правы простых працаўнікоў вёскі пры рэарганізацыі сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, змене іх формы ўласнасці, а таксама за пастаянны кантроль з боку грамадзянскай супольнасці за органамі ўлады.

Удзельнікі сустрэчы ў Магілёве прыйшлі да высновы, што падобныя круглыя сталы, прысвечаныя праблемам карупцыі і парушэнняў правоў працоўных пры рэарганізацыі сельгаспрадпрыемстваў, павінны праводзіцца кожны квартал.

Аграрное испытание «Белшины»

Пролог

Нынешние успехи Осиповичского района связывают с эффективной деятельностью его председателя райисполкома П.Шукаловича, который на этом посту трудится с 2003 года. Коллеги отмечают его несомненный опыт и талант руководителя, умение максимально эффективно распределять ресурсы и выполнять все поставленные задачи и планы, в том числе определённые программой социально-экономического развития Осиповичского района на 2011-2015 годы, глубокое уважение к человеку труда. Еще в 2011 году он пообещал, что в ближайшем будущем благодаря линии, которую проводит председатель облисполкома, ориентируя Могилевщину быть одним из успешных регионов республики, Осиповичи тоже в унисон с областью станут одним из самых привлекательных уголков Приднепровского края. Ему очень хочется, чтобы в Осиповичи приезжали с радостью, жили здесь с удовольствием, а уезжали с грустью.

Правда, в последние годы Осиповичский район в экономическом плане сильно сдал прежние позиции. В отчете местного райисполкома о социально-экономическом развитии района за 2013 год по всем важным показателям практически нет сравнений с уровнем предыдущего года – они попросту провалены. Указано лишь, что ввели в эксплуатацию жилья общей площадью 20,6 тыс.м2 – 70,5% годового задания. Впрочем, району есть чем и

похвалиться: за год внедрено 161 энергосберегающее мероприятие, на реализацию которых направлено 24,1 млрд. рублей (!). И даже приведен суммарный годовой экономический эффект от внедрения мероприятий – 6 357,6 тонн условного топлива, 121% от установленного задания в 5230 тонн. А ведь результат должен быть обязательно – по объемам прямых иностранных инвестиций Осиповичский район сопоставим со всей свободной экономической зоной «Могилев». Инвестиции в 2013 году составили 2,2 трлн. рублей и «подросли» на 23,8%, а вот производство продукции сельского хозяйства почему-то сократилось на 15,4%. Не радует ситуация и в промышленности. И если председателя облисполкома устраивает подобная эффективная деятельность района и его руководителя – область продолжит замыкать турнирную таблицу экономического соревнования в стране.

А что в Осиповичах с уровнем преступности и борьбой с коррупцией? К сожалению, тут Осиповичский район захватил прочное лидерство и вряд ли его в ближайшее время уступит. Уровень преступности на 10 тыс. населения остается самым высоким в области и продолжает расти – 146,7 (2012г. – 141,7) при уровне преступности по Могилевской области 99,8, по стране – 102,2. За 2013 год значительно, с 27 до 66, увеличилось число преступлений коррупционной и экономической направленности. За первое полугодие 2014 года общее количество преступлений возросло на 6,8%, в структуре преступлений наибольший удельный вес занимают кражи – 75,3%. В 2 раза увеличилось количество убийств, выявлено 18 фактов присвоения денежных средств и имущества в организациях госсектора (на 107млн. руб.). Коррупция выявлена в 2 учреждениях медобслуживания, по одной в сельхозорганизации, предоставлении санаторных услуг и частном секторе. Возбуждены уголовные дела против директора ОАО «Мирум» г.Минска, бывшего ведущего инженера по снабжению ДУКПП «Райсервис», зав. отделением УЗ «Бобруйский роддом». Согласитесь, при этой вороватой власти для Осиповичского района раскрытых преступлений маловато…

Впрочем, в 2012 году случился в Осиповичском районе коррупционный скандал республиканского масштаба, последствия которого ощущаются до сих пор.

Жизнь «Белшина-Агро» ОАО «Белшина» до 2014 года…

В июне 2007 года решением Могилевского облисполкома на базе сельскохозяйственного производственного кооператива «Колхоз «Липень» Осиповичского района был образован аграрный филиал ОАО «Белшина», который вошел в структуру предприятия. На первых порах это сельскохозяйственное подразделение шинников уверенно занимало лидирующие позиции и в животноводстве, и в выращивании сельскохозяйственных культур в Осиповичском районе. На фоне проблем других хозяйств «Белшина-Агро», благодаря поддержке со стороны головного предприятия, практически не испытывала трудностей с топливом и запасными частями для техники, закупкой семян высокой репродуктивности, комбикормами для животных. Аграрный цех шинников своевременно и в полном объеме получал все необходимое для продуктивной сельскохозяйственной деятельности, что способствовало достойной зарплате его работников.

Сегодня на балансе филиала находятся 14 животноводческих ферм, из которых семь – молочно-товарные, пять специализируются на откорме и выращивании крупного рогатого скота, а две – свиноводческие. В деревне Вязычин построена роботизированная ферма, которая обошлась шинникам более чем в два десятка миллиардов рублей - это самый настоящий суперсовременный сельскохозяйственный молочный цех, оснащенный по последнему слову науки и техники, и аналогов ему в нашей стране практически нет. На комплексе работает всего несколько человек, а все основные операции выполняют роботы, которыми управляют компьютерные системы. Даже председатель облисполкома, выступая как-то перед журналистами, порекомендовал работникам печатных и электронных СМИ области побывать на этом комплексе, чтобы самим посмотреть, как нужно сегодня организовывать прибыльное сельскохозяйственное производство, и рассказать об этом другим.

Что ж, Петр Михайлович по-своему был прав – ведь по итогам 2012 года коллектив «Белшина-агро» сразу в двух ведущих номинациях районного соревнования по социально-экономическому развитию – за получение наивысшей урожайности сахарной свеклы, а также за наиболее полное обеспечение животноводства кормами – вышел победителем и был удостоен дипломов I степени и денежных премий. Лучшим оказался филиал и в организации идеологической, информационно-пропагандистской и воспитательной работы и также

получил дипломы I степени и денежные премии.

До последнего времени о филиале вспоминали лишь с положительной стороны. Хозяйство из года в год демонстрировало устойчивую динамику развития, имея 7919 гектаров сельхозугодий (в том числе почти 4 тысячи га посевных площадей) и около 6 тысяч голов крупного рогатого скота. Дойное стадо также все последние годы давало хорошие показатели по надоям. Между тем в конце 2012 года деятельностью аграрного филиала ОАО "Белшина" заинтересовалось Управление по борьбе с экономическими преступлениями (УБЭП) УВД Могилевского облисполкома. Материалы проверки были направлены в прокуратуру области, которая и усмотрела в деятельности директора хозяйства признаки состава преступления, предусмотренного ч. 3 ст. 424 Уголовного кодекса Беларуси (злоупотребление властью или служебными полномочиями, совершенное должностным лицом, занимающим ответственное положение, либо при осуществлении функций по разгосударствлению или приватизации государственного имущества, либо повлекшее тяжкие последствия). По данным прокуратуры Могилевской области, подозреваемый в апреле–сентябре 2012 года, злоупотребляя служебными полномочиями, причинил ущерб хозяйству в размере около 130 миллионов рублей. По словам оперативников, бывший директор использовал свою должность исключительно для личной наживы. Несколько лет назад он приобрел участок для строительства дома в Осиповичах на имя своей матери, фиктивно оформив ее как нуждающуюся в улучшении жилищных условий работницу предприятия "Белшина-Агро". За силикатные блоки и кровлю рассчитался средствами организации. На строительстве его дома 9 месяцев трудились работники "Белшина Агро", в то время как в табеле учета рабочего времени им ставились рабочие дни на предприятии, и выплачивалась заработная плата. Всего оперативники выявили 10 фактов его преступной деятельности. А это злоупотребление властью, служебными полномочиями и дача взятки. Деньги в сумме 3 тысяч долларов он пытался передать следователям, чтобы те закрыли дело.

После этого оперативные службы МВД пришли на саму "Белшину", где следственный комитет возбудил несколько уголовных дел в отношении должностных лиц и аффилированных с ними бизнесменов, среди которых есть даже директор российской компании - нанесенный ими ущерб предприятию перевалил за миллиард рублей.

В результате судебных разбирательств бывший директор филиала Олег Грищенко водворен на 8 лет нары, соответствующие наказания ждут и других фигурантов коррупционных дел на Белшине. Но попробуем разобраться, что же произошло в филиале «Белшина-Агро» в 2012 году и почему за какие-то 130 миллионов рублей при таких масштабах воровства в стране посажен в тюрьму в общем-то успешный руководитель?

Обратим внимание на производственно-экономические показатели филиала за последние годы: объем валовой продукции в 2013 году снизился к уровню предыдущего года на 24,8 млрд. рублей («минус» 29,1%), выручка от реализации «упала» на 12%, себестоимость же реализованной продукции возросла на 56%, а убытки от реализации составили 28 млрд. рублей (за 2012 год получена прибыль от реализации продукции в 2,1 млрд. рублей). При этом объем помощи, выделенной филиалу в 2013 году, составил 69,9 млрд. рублей (175% к уровню 2012 г.), кредиты банков возросли на 26%.

Провал произошел практически по всем направлениям: производство молока в 2013 году уменьшилось по сравнению с предыдущим годом на 9,7%, мяса – на 52,9%, зерна – на 25,5%, сахарной свеклы – в три раза. Производство всех видов сельскохозяйственной продукции оказалось убыточным: рентабельность зерна (-24%), рапса (-16%), сахарной свеклы (-15%), молока (-20,5%), мяса КРС (-40%), свинины (-52%), а рентабельность продаж достигла непостижимого для восприятия рубежа в «минус» 40,7%.

Особенное внимание хочется обратить на политику руководства в отрасли растениеводства. Еще в 2012 году производство рапса имело рентабельность в 35,3%, сахарной свеклы – 5,4%, а денежная выручка от реализации семян рапса составляла 2,5 млрд. рублей, сахарной свеклы – 6,2 млрд. рублей (зерновые – только 526 млн. руб.), а в итоге две этих культуры формировали 94% денежной выручки от реализации продукции растениеводства.

В 2012 году принимается решение сократить посевы рапса с 430 до 130 га, а посевы сахарной свеклы с 350 до 150 гектаров и за их счет расширить посевы зерновых культур. В результате ни зерна, ни рапса, ни свеклы, ни продукции животноводства. Официально (в печати) провалы в животноводстве «Белшина-Агро» объясняются снижением продуктивности крупнорогатого скота (!!!), а также с сокращением поголовья свиней (они умудрились закрыть одну из трех свиноферм).

Вопрос ведь и в квалификации специалистов как филиала, головного предприятия ОАО «Белшина», так и работников рай- и облисполкома – без их ведома ни одна глупость на территории области не совершается. Сокращение посевов рапса и свеклы их этого разряда, особенно, свеклы – очень трудоемкой культуры, требующей наличия высококлассных специалистов, потерять которых при резком снижении доходов механизаторов очень даже просто. И потом, неужели в хозяйстве нельзя было распахать для производства зерна нужное количество гектаров сенокосов, коих имеется в наличии 4000 гектаров?

Особенно умиляют сказки чиновников от сельского хозяйства по обустройству производства молока – в филиале на строительство уникальных роботизированных ферм (а таких построено в мире около 5 тысяч) затрачено более 20 млрд. рублей. Кстати, таким же образом в Узденском районе рекламирует роботизированную ферму (единственная, уникальная, ферма будущего) «"Белита-Витэкс", также скромно умалчивая об экономической эффективности вбуханных в импортное оборудование валютных средств. Окупится ли вся эта «блажь за народные деньги» еще вопрос, а вот свести на «нет» кадры доярок вполне. Собственно, цена 20 млрд. рублей – это сокращение потребности в нескольких доярках. Но есть и другая сторона вопроса – дорогостоящее импортное оборудование обслуживают, порой, полуграмотные и не всегда трезвые слесари. Пройдет 10-15 лет и все эти роботы «лягут» под воздействием субъективных обстоятельств, а чиновники разных министерств вспомнят о возможностях собственных заводов. Но сегодня неплохо бы еще проверить и коррупционную составляющую импортных закупок оборудования для отрасли животноводства.

…и после

Сегодня по-разному характеризуют бывшего директора филиала в «Белшина-Агро» - одни считают самодуром (например, изгнал специалиста с должности за 1,5 года до пенсии, которому приходится до сих пор ездить в Осиповичи на работу), другие молятся на него, особенно, жители центральной усадьбы хозяйства Вязовницы, и наивно ждут возвращения на прежнюю должность.

За прошедшее время несколько человек примеряло на себя должность руководителя филиала – пока хороших результатов не получается. В тоже время 05.06.2014 года следственными органами возбуждено еще одно уголовное дело в отношении двух работников филиала «Белшина-Агро» по факту хищения денежных средств на сумму более 5,7 млрд. рублей. Одна из них, пенсионерка, кстати, клянется, что к воровству не имеет отношения, но кто ее будет слушать в мясорубке коррупционных разбирательств перед судьбоносными выборами для Президента. В пользу этого наблюдения двухнедельное содержание ее под стражей – к совести юных борцов в отношении меры пресечения к женщине, которая отдала всю жизнь сельскому хозяйству, взывать не стоит – не поймут.

Эпилог

В Осиповичском районе тему коррупции в «Белшина-Агро» стараются обойти, публично оценку правомерности действий бывшего директора официальные лица не афишируют. По итогам работы за 2013 год филиал «Белшина-Агро» особых почестей не снискал. Остальное, в том числе и борьба с экономическими преступлениями, в районе ведется по мелочам… наверное, до следующей активизации деятельности правоохранительных органов.

П.Мигурский

Экономия на железной дороге

Любое хорошее дело можно довести до абсурда, если к нему подходить формально. Например, экономия. К сожалению, пригородные перевозки для Белорусской железной дороги являются убыточными. Стоимость дизельного топлива растет. Цены на проезд регулируются государством и не повышаются по воле руководителей железной дороги, как бы им хотелось. Но все ли зависит от доходов, то есть кошелька пассажиров?

В понятии прибыли есть две составляющие, доходы и расходы. И если с доходами относительно ясно, то с расходами не совсем. Я уже приводил пример, как увеличивают без необходимости расходы по станции Рыжковичи. Железнодорожная администрация не искала приемлемого пути для обслуживания подъездного пути Шкловской бумажной фабрики. Решили просто построить товарную контору на станции Рыжковичи и набрать соответственно дополнительный штат работников. Это значительно увеличило расходы, да и клиентуре ездить на станцию Шклова в товарную контору было ближе.

При строительстве, а затем эксплуатации бумажной фабрики было решено организовать поезд для подвоза рабочих из Могилева. И вот уже почти десять лет такой поезд курсирует от Могилева до станции Шклов. Правда, его сейчас больше используют дачники, чем работники фабрики. Затем в целях экономии сократили поезд Орша – Могилев. Но чтобы вывозить пассажиров из Шклова пустили в обращение поезд Могилев – Шклов – Могилев.

Но хорошо это решение не было просчитано. Поезд из Могилева отправлялся так, что им мало кто пользовался. Я уже тогда пробовал довести до пассажирского отдела, как бывший графист отделения дороги, что его надо отправлять ближе к обеденному времени. Тогда будет больше желающих воспользоваться этим поездом. Да и стоять два часа на станции не выгодно экономически. Но ответ «Не лезь в наши дела» поставил точку на моем предложении. Теперь с приходом новых руководителей решили, что для экономии надо два поезда сократить. Сокращать утренний поезд до Шклова опасно, потому, что решение о пуске поезда решалось у Президента. И было принято соломоново решение. Утром поезд идет до Шклова и там стоит до 12.50, а затем возвращается обратно. Три с половиной часа поезд стоит по Шклову и мешает работе. Локомотивная бригада и кассиры находятся на работе. Одним словом расходы есть, доходов нет. А если учесть, что состав переставляют с одного пути на другой, то и топливо тратится непродуктивно. Можно было бы использовать полученные Могилевским локомотивным депо экономичные польские составы. В них вместимость меньше, но и расход топлива значительно меньше. Но их получили и по указанию управления дороги отправили в Минск. Так что расходы на эти составы висят на Могилевском локомотивном депо, а доходы получает Минское отделение. Кстати, о расходе топлива. Когда ходили дизель-поезда ДР1 с гидропередачей расход топлива был значительно меньше существующего. Но техника имеет предел работы, и надо было срочно решать вопрос замены. Как временный вариант решили модернизировать вагоны дизель поездов, а для передвижения использовать грузовой тепловоз М62. Расход топлива возрос сразу в полтора раза. Так что подтверждается истина, что самое постоянное – это временное. Была попытка замены дизелей на более экономичные. Но бывший начальник Белорусской железной дороги А.А. Сивак, ставший теперь министром транспорта, для совершенствования движения пригородных поездов, вокруг столицы реконструкции станций и закупки швейцарских составов так посадил Белорусскую дорогу в долговую яму, что о модернизации можно забыть надолго. Как и о закупке экономных одновагонных поездов Белорусского производства. При этом увеличил штат управленцев управлении дороги. Но, судя по приносимым доходам от новых поездов, срок окупаемости этого мероприятия растянется на неопределенное время.

Из этого можно сделать только один вывод. При существующей системе управления Беларусь будет долго зависеть от прихотей некомпетентных руководителей. Поучительно бы вспомнить притчу о талантах из Библии. Хозяин, уезжая на время, дал своим рабам по одному таланту. Когда вернулся, узнал, что один раб заработал с одного таланта десять, а другой раб, боясь потерять, спрятал его и не заработал ничего. Так и железная дорога вместо того что надо искать доходы занимается мнимой экономией. Но это уже другая тема.

Л.Осипов

Ці наведваў Аляксандр Пушкін наш горад Шклоў?

Пакуль навуковых крыніц, якія б паведамлялі, што вялікі рускі паэт Аляксанд Пушкін быў у Шклове не знойдзена. На запыт у галоўную навукова-даследчую скарбонку паэта музей А.С.Пушкіна ў Санкт-Пецярбурзе прыйшоў адказ: “Звесткі аб знаходжанні А.С.Пушкіна ў Шклове адсутнічаюць”. Між тым, аналізуючы старажытныя тракты, якія існавалі на той час у нашай мясцовасці, можна ўпэўнена сцвярджаць – вялікі паэт вандраваў менавіта праз наш горад.

Як вядома, Аляксандр Пушкін двойчы наведваўся ў Магілёў. Першы раз у 1820 годзе, калі быў адпраўлены ў Екацярынаслаў. А другі раз у 1824 годзе, калі вяртаўся з Адэсы.

Гістарычныя крыніцы паведамляюць, што Пецярбургска-Кіеўскі тракт быў пабудаваны напрыканцы 18 стагоддзя і ў межах Шклова паштовыя станцыі размяшчаліся ў населеных пунктах – Александрыя, Шклоў, Дабрэйка, Магілёў. Звыш 70 год праз гэты тракт ішоў інтэнсіўны рух, пакуль у 1850 годзе была закончана пракладка новай дарогі, якая на гэты раз пралегла па левабярэжжы Дняпра, дзе яна знаходзіцца і цяпер. Яшчэ да пачатку будаўніцтва новай дарогі ў 1836 годзе члены Шклоўскага кагала звярнуліся з просьбай у Міністэрства ўнутраных спраў аб напрамку лініі праз Шклоў “по тракту, доселе там существующему”. На гэта атрымалі адмоўны адказ.

Такім чынам, абодвы разы, шлях паэта праходзіў праз паштовую станцыю ў Шклове. Для Аляксандра Пушкіна незаўважаным наш горад не павінен быў застацца. Ён добра ведаў аб Шклове, апісваючы жыццё вядомага мясцовага ўладара Сямёна Зорыча.

Падводзячы вынікі, упэўнена можна сцвярджаць, што існуюць усе падставы для далейшай даследчай працы ў накірунку “А.Пушкін і Шклоў”. Архіўныя крыніцы, магчыма, захоўваюць цікавыя звесткі аб гэтым.

А вось пра сустрэчу А.С.Пушкіна з магіляўчанамі мы ведаем па ўспамінах “Сустрэча з А.С.Пушкіным у Магілёве”, якія пакінуў афіцэр гусарскага палка А.П.Распопаў. Гэтыя ўспаміны ў 1876 годзе надрукаваў часопіс “Русская старина”. “6-га жніўня 1824 года паштовы наглядчык сказаў мне, што прыехаў з Адэсы калежскі асэсар Пушкін; я ў тое ж імгненне кінуўся ў пасажырскі пакой і, узяўшы Пушкіна за руку, спытаў яго: - Вы, Аляксандр Сяргеевіч, пэўна, мяне не пазналі? Я – пляменнік былога дырэктара ліцэя Ягора Антонавіча Энгельгарда; у святочныя дні мяне забіралі з корпуса ў Царскае Сяло, дзе вы з Дэльвігам прымушалі мяне дэкламаваць вершы. Пушкін, абдымаючы мяне, сказаў: “Помню, помню, Саша, ты жвавы быў кадэт”. Я ад радасці такой нечаканай сустрэчы не ведаў, што рабіць: стрымгалоў пабег да таварышаў, што гулялі са мною, паведаміў ім, што праездам наш дарагі паэт А.С.Пушкін. Усе паспяшаліся на пошту. Захаплення немагчыма апісаць. Пушкін загадаў адкаркаваць некалькі пляшак шампанскага. Пілі за ўсё, што прыходзіла ў галаву: за здароўе няні, Тані і за ўспамін душы Ленскага…

Але гэтага для нас была мала: у захапленні, што з намі вялікі паэт Пушкін, мы ўзялі яго на рукі і аднеслі непадалёк на маю кватэру. Пушкін быў у захапленні нашым энтузіязмам, мы ўзнімалі на руках дарагога госця, пілі за яго здароўе, за гонар і славу ўсяго ім створанага. Пушкін быў у самым вясёлым і прыемным настроі, ён ускочыў на стол і прадэкламаваў:

Я люблю вечерний пир,
Где веселье председатель,
А свобода, мой кумир,
За столом законодатель.
Где до утра слова пей
Заглушает звуки песен:
Где просторен круг гостей,
А кружок бутылок тесен.

Віно ўсім разгарачыла галавы, і прысутны князь Абаленскі закрычаў:

- Панове, гэтая ўачыстасць выходзіць за межы агульнай радасці, яна павінна быць адзначана чым-небудзь асаблівым. Панове! Зробім нашаму куміру ванну з шампанскага! Усе згадзілся, але Пушкін, усміхнуўшыся, сказаў:

- Сябры мае, шчыра ўдзячны, сапраўды было б цудоўна, я не супраць папаласкацца ў шампанскім, але спяшаюся: ехаць трэба.

Гэта было ў 4 гадзны раніцы. Мы ўсім гуртом правадзілі яго на пошту, дзе зноў адзначылі шампанскім і, развітаўшыся, пажадалі яму шчаслівай дарогі”.

Наступнымі паштовымі станцыямі павінны былі быць Дабрэйка і Шклоў. Гэтыя падзе адбыліся 190 год таму. Таму прапаную ўсім аматарам вершаваных радкоў таксама падняць бакал шампанскага за паэтычны талент **вялікага паэта**.

Алесь Грудзіна

Зампредседателя Шкловского райисполкома подозревается в коррупционном преступлении

Могилев, 21 августа. Главное управление Следственного комитета расследует коррупционное дело в отношении заместителя председателя Шкловского райисполкома, курирующего вопросы строительства и коммунального хозяйства. Как сообщила БелаПАН официальный представитель Следственного комитета Беларуси Юлия Гончарова, в отношении зампредседателя возбуждено дело по части 3 статьи 424 (злоупотребление властью или служебными полномочиями), что связано с вопросами, которые курирует чиновник. Мера пресечения в отношении него не применялась, отметила официальный представитель.

Владимир Лапцевич, БелаПАН.

P.S. Шкловские чиновники опять “откололи” коррупционный скандал на малой Родине Президента. О жадности местных руководителей ходят легенды, а от карающего меча Следственного комитета не спасают даже минские связи. И сколько Президент не предупреждает чиновничью погань о последствиях личной нескромности на службе государевой, не унимаются - воруют, строят, крышуют - это у них называется “уметь жить”.

Рэдактар І.Мігурскі Надрукавана на ўласным абсталяванні. Наклад: 299 ас.
Адрас: 213018 Магілёўская в., Шклоўскі р., в.Дабрэйка. Тэл. 8 02239 92618;
E-mail: agro56@tut.by. РАСПАЎСЮД БЯСПЛАТНЫ. Падпісана ў друк 04.09.2014